# ИСТОРИЧЕСКИЕ НАУКИ

УДК 94(476)

**А.М. АБУХАВА**, канд. гіст. навук, дацэнт,
дацэнт кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі
і спецыяльных гістарычных дысцыплін
Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы,
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь
*E-mail: obuhova_en@grsu.by*



*Статья поступила 8 декабря 2021 г.*

## РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ ГРУНВАЛЬДСКАЙ БІТВЫ Ў НАВУЧАЛЬНЫХ ДАПАМОЖНІКАХ ДЛЯ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ[1]

*У артыкуле разгледжаны асаблівасці рэпрэзентацыі Грунвальдскай бітвы ў навучальных дапаможніках для вышэйшай школы, выдадзеных у 1990-х-2010-х гг. у Рэспубліцы Беларусь. Паказана эвалюцыя ацэнкі ролі гэтай бітвы ў гісторыі Вялікага Княства Літоўскага, а таксама прааналізавана асвятленне ўплыву Грунвальдскай бітвы на лёс беларускага народа.*

***Ключавыя словы:*** *Вялікае Княства Літоўскае, Грунвальдская бітва, гісторыя Беларусі, вышэйшая адукацыя, Рэспубліка Беларусь.*

**ABUKHAVA Alena M.,** PhD in Hist. Sc., Associate Professor
Associate Professor of the Department of History of Belarus, Archeology and Special Historical Disciplines
Yanka Kupala State University of Grodno, Republic of Belarus

## REPRESENTATION OF THE BATTLE OF GRUNWALD IN TEXTBOOKS FOR HIGHER EDUCATION IN THE REPUBLIC OF BELARUS

*The article examines the features of the representation of the Grunwald battle in textbooks for higher education which were published in the Republic of Belarus in 1990s – 2010s. The evolution of estimation of the role of this battle in the history of the Grand Duchy of Lithuania is shown. The coverage of the influence of the Grunwald battle on the fate of the Belarusian people is analyzed.*

***Keywords:*** *Grand Duchy of Lithuania, Battle of Grunwald, history of Belarus, higher education, Republic of Belarus*

[1] Статья публикуется в авторской редакции.

З 1992 г. у блоке сацыяльна-гуманітарных дысцыплін ва ўстановах вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь з'явілася дысцыпліна "Гісторыя Беларусі" [1, с. 267]. Навучальныя дапаможнікі па гэтай дысцыпліне пачалі ствараца ў пачатку 1990-х гг. гісторыкамі-навукоўцамі, што абумовіла адлюстраванне ў іх як бягучага стану развіцця гістарыяграфіі, так і палітыкі дзяржавы па фармаванні пажаданых вобразаў мінулага [2, с. 17]. Адным з найбольш пазнавальных "вобразаў мінулага" з эпохі сярэднявечча з'яўляецца Грунвальдская бітва, якая заняла трэцяе месца ў пераліку падзей гісторыі Беларусі да 1917 г., што выклікаюць гонар у жыхароў нашай краіны [3]. Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца выяўленне асаблівасцяў рэпрэзентацыі Грунвальдскай бітвы ў навуковых дапаможніках па гісторыі Беларусі для вышэйшай школы, выдадзеных у Рэспубліцы Беларусь у 1990–2010-я гг. Дадзенае пытанне атрымала недастатковае асвятленне ў айчыннай гістарыяграфіі. Так, Г. Сагановіч, прааналізаваўшы шэраг навучальных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі 1990-х – пачатку 2000-х гг., вызначыў наяўнасць розных падыходаў да апісання Грунвальдскай бітвы (ад маляўнічага апісання цяжкага змагання з крыжакамі-заваёўнікамі да простага ўпамінання ў пераліку фактаў, што прывялі да васальнага падпарадкавання Тэўтонскага Ордэна Польшчы [2, с. 302–303, 309–314]), аднак не паказаў этапаў у эвалюцыі поглядаў на дадзеную гістарычную падзею ў вучэбнай літаратуры. Канцэпцыю айчыннай гісторыі, выкладзеную ў "Нарысах гісторыі Беларусі", прааналізаваў В.А. Белазаровіч [1, с. 266–267]. Ім было адзначана, што дадзенае выданне стала асновай для стварэння шэрагу навучальных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў [4, с. 311–312; 5; 6; 7; 8; 9; 10; 11]. Крыніцамі даследавання сталі навуковыя дапаможнікі, што мелі грыф Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь [4; 6; 11; 12; 13; 14; 15] ці Вучэбна-метадычнага аб'яднання па гуманітарнай адукацыі для студэнтаў ВНУ [16], у тым ліку для гістарычных спецыяльнасцяў, а таксама шэраг іншых дапаможнікаў, што былі пазначаны ў спісе асноўнай літаратуры ў тыпавой вучэбнай праграме "Гісторыя Беларусі" для вышэйшых навучальных устаноў [7; 8; 9; 10; 17; 18; 19].

Асноўная частка. У "Нарысах гісторыі Беларусі" (частка 1, 1994) Грунвальдская бітва разглядалася як асобны эпізод змагання з крыжакамі (без згадкі пра Вялікую вайну 1409–1411 гг.), пагроза з боку якіх была для Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) не меншай за мангола-татарскую [4, с. 117]. Паведамлялася, што крыжакі імкнуліся анямечыць этнічныя групы, што насялялі Усходнюю Еўропу ці нават знішчыць фізічна, таму "…барацьба з тэўтонамі стала барацьбой за выжыванне славянства", а на пярэднім краі гэтай барацьбы "…стаялі беларускія землі, беларускі народ, які закрываў сабой ад крыжацкай навалы іншыя ўсходнеславянскія землі" [4, с. 118]. Аўтары досыць падрабязна апісалі ход бітвы 15 ліпеня 1410 года, назвалі харугвы з беларускіх зямель, што прынялі ў ёй удзел, зрабіўшы выснову, што перамога саюзных войск у гэтай бітве нанесла Тэўтонскаму ордэну такі моцны ўдар, што "…землі ўсходніх славян пяць стагоддзяў не ведалі германскай агрэсіі" [4, с. 120].

У вучэбным дапаможніку "Гісторыя Беларусі" (1997), падрыхтаваным калектывам гісторыкаў пад навуковай рэдакцыяй А.Г. Каханоўскага і А.А. Яноўскага, Грунвальдская бітва разглядалася ў кантэксце знешней палітыкі ВКЛ у часы кіравання Вітаўта і была названа фіналам барацьбы балтаў і славян з крыжакамі [5]. Адзначалася, што ў гэтай бітве быў "…сакрушальна разбіты люты вораг – Тэўтонскі ордэн, як пагражаў народам балта-славянскага рэгіёну фізічным і духоўным знішчэннем" [5, с. 73].

У дапаможніку "Гісторыя Беларусі" (частка 1, 1998), падрыхтаванай калектывам гісторыкаў пад рэдакцыяй Я.К. Новіка і Г.С. Марцуля, адзначалася, што ўнія з Польшчай дазволіла "…аб'яднаць сілы абедзвюх дзяржаў супраць агульных знешніх ворагаў", а галоўным ворагам ВКЛ у XIV – першай палове XV стст. былі "…рыцары Тэўтонскага і Лівонскага ордэнаў" [6, с. 115]. Згадваючы аб Вялікай вайне 1409–1411 гг., аўтары, тым не менш, з усіх яе эпізодаў разглядзелі толькі Грунвальдскую бітву, у выніку якой, як зазначалася, крыжакі былі разбіты ўшчэнт, а нямецкая агрэсія супраць ВКЛ спынена. Як і ў "Нарысах гісторыі Беларусі", аўтарамі былі

пералічаны харугві з беларускіх зямель, што ўдзельнічалі ў бітве пад Грунвальдам, падкрэслена стойкасць смаленскіх ваяроў [6, с. 115].

У 2000 годзе выйшла першая частка курса лекцый “Гісторыя Беларусі. Са старажытных часоў да канца XVIII ст.”, падрыхтаваная калектывам гісторыкаў Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы [20]. У гэтым дапаможніку Грунвальдская бітва разглядалася ў кантэксце падзей Вялікай вайны 1409–1411 гг. Аўтарамі адзначалася, што “…Крэўская унія аб’яднала беларусаў, літоўцаў і палякаў у сілу, здольную супрацьстаяць бесперапыннай агрэсіі крыжакоў” [20, с. 233]. Таксама было падкрэслена, што “…скрушэнне агрэсіўнага суседа стала жыццёвай неабходнасцю літвінаў і палякаў” [20, с. 234]. Як і ў “Нарысах гісторыі Беларусі”, чытачу быў прадстаўлены склад войска ВКЛ з акцэнтам на беларускіх удзельніках, маляўніча апісаны ход бітвы 15 ліпеня 1410 года [20, с. 238]. Было адзначана, што ў войску Вітаўта загінуў амаль кожны другі ваяр, у “…пераважнай большасці гэта былі сыны беларускай зямлі, якія прынялі на сябе асноўны цяжар бітвы” [20, с. 239]. Адзначалася вялікае міжнароднае значэнне Грунвальдскай бітвы: была не толькі знішчана армія Тэўтонскага ордэна, але і падарвана ягоная ваенна-палітычная магутнасць, асобна было падкрэслена, што “…Грунвальд для беларусаў – тое ж, што Кулікоўская бітва для рускіх” [20, с. 240].

“Смяротная пагрозай” былі названыя крыжакі ў вучэбным дапаможніку для студэнтаў ВНУ “Нарысы гісторыі Беларусі” (2000 г.) П.Г. Чыгрынава, прафесара Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь [7]. Магчымасць ліквідацыі гэтай пагрозы з’явілася, па меркаванні аўтара, пасля збліжэння і ўзмацнення ВКЛ і Польскага каралеўства. Перамога ў Грунвальдскім бітве названа аўтарам “апафеозам вайскова-палітычнай дзейнасці Вітаўта” [7, с. 90]. Апісаўшы падрыхтоўку войскаў ВКЛ да паходу на Грунвальд і іх склад, а таксама пярэдадзень бітвы, аўтар не разглядаў асобна ход апошняй, адзначыўшы толькі, што вырашальным для яе зыходу быў манеўр несапраўднага адступлення, выкананы войскамі ВКЛ [7, с. 91]. Аўтар адзначае, што на поле каля Грунвальда загінула шмат беларусаў з войска Вітаўта, а вынікамі бітвы называе спыненне двухсотгадовай агрэсіі немецкіх рыцараў, узрастанне міжнароднага аўтарытэта ВКЛ, умацаванне пазіцый Вітаўта як кіраўніка дзяржавы і нават паскарэнне кансалідацыі беларускага этнасу [7, с. 91–92].

Дапаможнік П.Г. Чыгрынава перавыдаваўся ў 2004 і 2007 гг., ацэнкі Грунвальдскай бітвы ў дадзеных выданнях былі ідэнтычныя тэзісам дапаможніка 2000 года [17, с. 90–92; 18, с. 90–92]. Патрэбна адзначыць, што ў іншых дапаможніках па гісторыі Беларусі для студэнтаў ВНУ, выдадзеных на працягу 2000-х гадоў, роля Вітаўта ў Грунвальдскай бітве не вылучалася асобна, а апошняя разглядалася як выдатны вынік ваеннага супрацоўніцтва ВКЛ і Польшчы, закладзенага Крэўскай уніяй. Падобная пазіцыя была выкладзена ў дапаможніках “Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі” (2003; 2005), створаных калектывам выкладчыкаў ВНУ з Мінска, Гродна і Горак пад кіраўніцтвам В.А. Сосны [8; 19]. Тэўтонскі Ордэн разглядаўся як самы небяспечны вораг для ВКЛ і Польшчы ў канцы XIV – пачатку XV стст., што разам з Крэўскай уніяй зрабіла дадзеныя манархіі “натуральнымі саюзнікамі” [8, с. 44–45]. Грунвальдская бітва апісвалася па схеме, падобнай да прыведзенай у першай частке дапаможніка “Гісторыя Беларусі” (1998) [6, с. 115]. Вынікамі перамогі саюзных войск пад Грунвальдам, на думку аўтараў, сталі заканчэнне ваеннай моцы Ордэна і яшчэ большае збліжэнне ВКЛ і Польшчы, паколькі бітва прадэманстравала карысць ад аб’яднання сіл дадзеных дзяржаў [8, с. 45].

У вучэбным дапаможніку П.Ф. Дзмітрачкова “Беларусь у складзе Вялікага Княства Літоўскага (другая палова XIII – першая палова XVII стст.” (2003) Грунвальдская бітва разглядалася як вырашальная падзея Вялікай вайны 1409–1411 гг. Аўтар таксама згадвае аб Крэўскай уніі як паваротным пункце, пасля якога ўзрасло ўзаемадзеянне ВКЛ і Польшчы ў барацьбе з крыжакамі, і менавіта “…сумесныя дзеянні польскіх і беларускалітоўскіх войскаў забяспечылі перамогу над нямецкімі рыцарамі” [12, с. 186]. П.Ф. Дзмітрачкоў не апісваў ход Грунвальдскай бітвы і не прыводзіў страты бакоў, затое ім былі названы вынікі як самой бітвы (былі падарваныя ваенныя сілы і агульныя міжнародныя пазіцыі Тэўтонскага Ордэна), так і вайны

1409–1411 гг. (ВКЛ вярнула сабе Жамойць) [12, с. 187].

У дапаможніку “Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі” І. Саракавіка адносіны з Тэўтонскім Ордэнам былі названы найбольш складаным з ўсіх накірункаў знешней палітыкі ВКЛ, адзначана, што ад крыжакоў ішла пагроза анямечвання балтыйскіх і славянскіх земляў [9, с. 73]. Менавіта апошняя, на думку аўтара, падштурхнула ВКЛ да саюзу з Польшчай, і вяршыняй ваеннага супрацоўніцтва дзвюх дзяржаў стала перамога ў Грунвальдскай бітве, якая прывяла да таго, што “…немцы на працягу пяці стагоддзяў не нападалі на славянскія землі” [9, с. 74]. Вынікам ваенна-палітычнага саюзу Польшчы і ВКЛ, заключанага па Крэўскай уніі, называецца Грунвальдская бітва ў навучальным дапаможніку “Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветных цівілізацый” (2009), дзе адзначалася, што пасля сакрушальнай паразы ў дадзенай бітве “…дзяржава крыжакаў так і не змагла акрыяць, а іх набегі на землі Польшчы і Літвы спыніліся” [10, с. 68].

У 2009–2013 гг. чатыры разы выдаваўся навучальны дапаможнік “Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да 2008 г. (2010, 2013) года”, падрыхтаваны Я.К. Новікам, І.Л. Качалавым і Н.Я. Новік [13; 21]. Апісанне Грунвальдскай бітвы адбывалася ў дадзеных выданнях згодна са схемай, ўжытай у першай частцы “Гісторыі Беларусі” (1998) [6, с. 115], аднак была акцэнтавана ўвага на этнічнай прыналежнасці ўдзельнікаў канфлікту. Так, галоўным ворагам ВКЛ у XIV – пачатку XV стст. называліся “…немцы Тэўтонскага і Лівонскага Ордэнаў”, вынікам бітвы сталася тое, што “…нямецкая экспансія на ўсход была прыпынена больш чым на 500 год” [21, с. 90]. Аўтары дапаможніка адзначылі шматэтнічны склад удзельнікаў саюзных войскаў Польшчы і ВКЛ, падкрэсліўшы, што “…пад Грунвальдам перамагло сяброўства, вайсковае братэрства ўсходніх і заходніх славян, а таксама іншых народаў, што прымалі ўдзел у бітве” [21, с. 91].

Ва ўсіх вышэйназваных дапаможніках крыжакі разглядаліся як самы небяспечны вораг ВКЛ у канцы XIV – пачатку XV стст. Аднак зусім іншы погляд на дадзенае пытанне быў выкладзены ў першай частцы вучэбнага дапаможніка “Гісторыя Беларусі” (2003), аўтарам якога быў магілёўскі гісторык Я.І. Трашчанок. Ім адзначалася, што пагроза з боку крыжакоў для беларускіх, літоўскіх і польскіх земляў “…не ішла ні ў якое параўнанне з татарскай” і не была галоўнай прычынай заключэння Крэўскай уніі [11, с. 46–47]. Грунвальдскую бітву аўтар згадваў у пераліку падзей, пераўтварыўшых тэрыторыі Тэўтонскага Ордэна ў васала Польшчы ў пачатку XVI ст., назваўшы яе “…грунвальдскім разгромам 1410 г.” [11, с. 47].

У 2014–2016 гг. выйшаў шэраг вучэбных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў, у якіх зніклі ацэнкі канфлікту з крыжакамі ў XIV–XV стст. як барацьбы з нямецкімі каланізатарамі, а Грунвальдская бітва перастала разглядацца як выніковая падзея барацьбы славян і балтаў супраць немцаў-агрэсараў.

У навучальным дапаможніку «Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі» (2014), напісаным калектывам гісторыкаў з Гомеля, Грунвальдская бітва разглядалася ў кантэксце Вялікай вайны 1409–1411 гг. [14, с. 132–134]. Ход бітвы не быў адлюстраваны на старонках дапаможніка, хаця аўтарамі быў падрабязна апісаны склад сіл удзельнікаў бітвы, у тым ліку з беларускіх земляў, паказана размяшчэнне саюзных войск на полі каля Грунвальда [14, с. 133]. Да вынікаў перамогі саюзных войскаў у Грунвальдскай бітве былі аднесены спыненне паходаў крыжакоў на Польшчу, Беларусь і Літву, адкрыццё шляхоў праз Балтыйскае мора да еўрапейскіх гандлёвых гарадоў [14, с. 134]. Дадзены дапаможнік быў перавыдадзены ў 2016 годзе, ацэнкі Грунвальдскай бітвы ў ім засталіся ідэнтычнымі выданню 2014 года [15, с. 133–134].

П.І. Брыгадзін ў вучэбным дапаможніку ”Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі” (2015) таксама разглядаў Грунвальдскую бітву як падзею Вялікай вайны 1409–1411 гг., а апошняя вывучалася ў кантэксце знешней палітыкі ВКЛ часоў кіравання Вітаўта [16, с. 56]. Ахарактарызаваўшы склад аб’яднанага войска, аўтар адразу прывёў вынікі бітвы (разгром крыжакаў і гібель ўсяго кіраўніцтва Тэўтонскага ордэна), згадаў страты войска Вітаўта і перайшоў да аповеду пра далейшыя падзеі Вялікай вайны 1409–1411 гг., у выніку якой “…магутнасць

Тэўтонскага ордэна была сур'ёзна падарвана" [16, с. 57].

П.Ф. Дзмітрачкоў у вучэбна-метадычным комплексе "Гісторыя Беларусі. Са старажытных часоў да канца XVIII ст." (2015 г.) назваў адносіны паміж ВКЛ і Тэўтонскім Ордэнам складанымі і напружанымі, адзначыўшы, што іх нельга звесці толькі да ваенных канфліктаў, бо вялікія князі літоўскія неаднаразова ўступалі ў хаўрусы з Ордэнам, выкарыстоўвалі яго сілы ў міжусобнай барацьбе [22, с. 201]. Грунвальдскую бітву гісторык назваў самай буйной і важнай падзеяй Вялікай вайны 1409–1411 гг., "…пераломным момантам у адносінах ВКЛ з крыжакамі", якая "…падарвала ваенныя сілы Тэўтонскага Ордэна, былі аслаблены яго міжнародныя пазіцыі". Адзначалася, што менавіта сумесныя дзеянні ваенных сіл Польшчы і ВКЛ забяспечылі перамогу над крыжакамі. Нягледзячы на тое, што дадзены дапаможнік быў разлічаны на студэнтаў спецыяльнасці "Гісторыя", ні падрыхтоўка і ход бітвы, ні сілы бакоў і іх страты не былі ахарактарызаваны на яго старонках [22, с. 201].

Такім чынам, можна вызначыць тры асноўныя этапы ў рэпрэзентацыі Грнувальдскай бітвы на старонках вучэбных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі для вышэйшай школы. У 1990-я гады былі закладзены тры варыянты апісання дадзенай гістарычнай падзеі: 1) пераможны фінал змагання супраць немцаў-крыжакаў, што хацелі знішчыць балтаў і славянаў Усходняй Еўропы і каланізаваць іх землі; 2) кульмінацыйны момант Вялікай вайны 1409–1411 гг.; 3) вышэйшае дасягненне ў знешнепалітычнай дзейнасці вялікага князя Вітаўта. У другім варыянце ў якасці перадумовы перамогі пры Грунвальдзе называлася Крэўская ўнія, заключэнне якой дазволіла аб'яднаць ваенныя сілы ВКЛ і Польшчы. Ва ўсіх дапаможніках Тэўтонскі Ордэн называўся галоўным ворагам ВКЛ, які згубіў як армію, так і палітычны аўтарытэт пасля разгрому пад Грунвальдам; адзначаўся актыўны ўдзел ў Грунвальдскай бітве ваяроў з зямель сучаснай Беларусі, часам прыводзіліся прыклады іх мужнасці і дадзеныя аб стратах войска ВКЛ.

У дапаможніках для студэнтаў ВНУ, выдадзеных у 2003–2013 гг., перамога пад Грунвальдам пераважна разглядалася як вынік паспяховага ваеннага супрацоўніцтва ВКЛ і Польшчы, якія змагаліся з агульным ворагам – крыжакамі, аднак некаторыя аўтары па-ранейшаму бачылі ў ёй фінал славянскага змагання з немцамі-агрэсарамі. З 2014 года ў навучальнай літаратуры для ВНУ замацавалася апісанне Грунвальдскай бітвы як вырашальнай падзеі Вялікай вайны 1409–1411 гг., размяжоўваліся вынікі непасрэдна бітвы і названага ваеннага канфлікту з Ордэнам, а таксама цалкам знікла этнічная трактоўка супрацьстаяння крыжакоў і ВКЛ.

**Спіс літаратуры**

1. Белозорович, В. А. Формирование и развитие концепции истории Беларуси в отечественной историографии (вторая половина XIX – начало XXI века) / В. А. Белозорович. – Гродно : ГрГУ, 2020. – 335 с.
2. Сагановіч, Г. Грунвальд у беларускай гісторыі : спроба разбору палітычнага міфа / Г. Сагановіч. – Мінск : Медысонт, 2015. – 416 с.
3. Ластоўскі, А. Гістарычная памяць у Беларусі: адметнасці і праблемы / А. Ластоўскі // Беларускі калегіюм [Электронны рэсурс]. – 2021. – Рэжым доступа: https://belcollegium.by/alyaksej-lastouski-gistarychnaya-pamyac-u-belarusi-admetnasci-i-prablemy-lekcyi-1-2/. – Дата доступа: 20.07.2021.
4. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. / Акадэмія навук Беларусі, Інстытут гісторыі ; рэдкал.: М. П. Касцюк [і інш.]. – Мінск : «Беларусь», 1994. – Ч. 1 / М. П. Касцюк [і інш.].– 1994. – 527 с.: іл.
5. История Беларуси : учебное пособие для вузов, колледжей, лицеев, гимназий и школ / Белорус. гос. ун-т ; В. В. Григорьева [и др.] ; под ред. А. Г. Кохановского, О.А. Яновского. – Минск : МП «Беларыт», 1997. – 446 с.
6. Гісторыя Беларусі : вучэб. дапам. у 2 ч. / пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – Ч. 1. Ад старажытных часоў – па люты 1917 г. / Я.К. Новік [і інш.]. – 1998. – 416 с.
7. Чигринов, П. Г. Очерки истории Беларуси : учеб. пособие для вузов / П. Г. Чигринов. – Минск : Выш. шк., 2000. – 460 с.
8. Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі : дапам. / У. Р. Казлякоў [і інш.] ; пад рэд. Л. В. Лойка. – Мінск, 2003. – 347 с.

9. Саракавік, І. А. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі / І. А. Саракавік. – Минск : Современная школа, 2006. – 456 с.
10. История Беларуси: в контексте мировых цивилизаций : учеб. пособие / В. И. Голубович [и др.] ; под ред. В. И. Голубовича, Ю. М. Бохана. – Минск : Экоперспектива, 2009. – 464 с.
11. Трещенок, Я. И. История Беларуси : учеб. пособие для студ. вузов / Я. И. Трещенок. – Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2003. – Ч. 1. Досоветский период. – 2003. – 175 с.
12. Дзмітрачкоў, П. Ф. Беларусь у складзе Вялікага Княства Літоўскага (другая палова XIII – першая палова XVII стст.) : вучэб. дапам. для студэнтаў ВНУ / П. Ф. Дзмітрачкоў. — Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2003. — 312 с. : іл.
13. Новік, Я. К. Гісторыя Беларусі: ад старажытных часоў – па 2008 г.: вучэб. дапам. для студ. устаноў, забяспеч. атрыманне выш. адукацыі / Я. К. Новік, І. Л. Качалаў, Н. Я. Новік. – Мінск : Вышэйшая школа, 2009. – 512 с.
14. История Беларуси в контексте европейской цивилизации : учеб. пособие для студ. учреждений высшего образования / С. А. Елизаров [и др.]. – Минск : Вышэйшая школа, 2014. – 399 с.
15. История Беларуси в контексте европейской цивилизации : учеб. пособие для студ. учреждений высшего образования / С. А. Елизаров [и др.]. – 2-е изд., испр. – Минск : Вышэйшая школа, 2016. – 399 с.
16. Брыгадзін, П. І. Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цівілізацыі : вучэб. дапам. / П. І. Брыгадзін. – Мінск : ДІКСТ БДУ, 2015. – 288 с.: іл.
17. Чигринов, П. Г. Очерки истории Беларуси : учеб. пособие для вузов / П. Г. Чигринов. – 2 изд., перераб. и доп. – Минск : Выш. шк., 2004. – 463 с.
18. Чигринов, П. Г. Очерки истории Беларуси : учеб. пособие для вузов / П. Г. Чигринов. – 3 изд., испр. – Минск : Выш. шк., 2007. – 464 с.
19. Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі : дапам. / У. А. Сосна [і інш.] ; пад рэд. Л. В. Лойка. – 2-е изд., паш. і папр. – Мінск : РІВШ, 2005. – 333 с.
20. Гісторыя Беларусі : курс лекцый. У 2 ч. / І. П. Крэнь [і інш.]. – Мінск : РІВШ БДУ, 2000. – Ч. 1. Са старажытных часоў да канца XVIII ст. – 2000. – 656 с.
21. Новик, Е. К. История Беларуси. С древнейших времен до 2013 г : учеб. пособие для студ. учреждений, обесп. получение высшего образования / Е. К. Новик, И. Л. Качалов, Н. Е. Новик. – 4-е изд., испр. и доп. – Минск : Выш. шк., 2013. – 558 с.
22. Дмитрачков, П. Ф. История Беларуси. С древнейших времен до конца XVIII в. : учеб.-метод. комплекс для студ. истор. специальностей / П. Ф. Дмитрачков. – Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2015. – 354 с.

**References**

1. Belozorovich V.A. *Formirovanie i razvitie kontseptsii istorii Belarusi v otechestvennoy istoriografii (vtoraya polovina XIX – nachalo XXI veka)* [Formation and development of the concept of the history of Belarus in national historiography (second half of the XIX – early XXI century)]. Grodno, Grodnenskii gosudarstvennyi universitet, 2020. 335 p. (In Russian)
2. Saganovich G. *Grunval'd u belaruskaj gistoryi: sproba razboru palitychnaga mifa* [Grunwald in Belarusian history: an attempt to analyze a political myth]. Minsk, Medysont Publ., 2015. 416 p. (In Belarusian)
3. Lastouski, A. Gistarychnaya pamyats' u Belarusi: admetnastsi i prablemy [Historical memory in Belarus: features and problems]. *Belaruski kalegiyum* (In Belarusian). Available at: https://belcollegium.by/alyaksej-lastouski-gistarychnaya-pamyac-u-belarusi-admetnasci-i-prablemy-lekcyi-1-2/ (accessed 20.07.2021).
4. Kascjuk M.P. et al. *Narysy gistoryi Belarusi. Chastka 1.* [Essays on the history of Belarus, part 1]. Eds. Kascjuk M.P. et al. Minsk, Belarus' Publ., 1994. 527 p. (In Belarusian).
5. Grigor'eva V.V. et al. *Istoriya Belarusi* [History of Belarus]. Eds. Kokhanovskiy A.G., Yanovskiy O.A. Minsk, Belaryt Publ., 1997. 446 p. (In Russian)
6. Novik Ya.K. et al. *Gistoryja Belarusi. Chastka 1. Ad starazhytnyh chasow pa luty 1917 g.* [History of Belarus. Part 1. From ancient times to February 1917]. Eds. Novik Ya.K.,

Marcul' G.S. Minsk, Universiteckae, 1998. 416 p. (In Belarusian)
7. Chigrinov P.G. *Ocherki istorii Belarusi* [Essays on the history of Belarus]. Minsk, Vysheyshaya shkola Publ., 2000. 460 p. (In Russian)
8. Kazlyakow U.R. et al. *Gistoryja Belarusi w kantjeksce ewrapejskaj cyvilizacyi* [History of Belarus in the context of European civilization]. Eds. Lojka L.V. Minsk, 2003. 347 p. (In Belarusian)
9. Sarakavik, I.A. *Gistoryja Belarusi w kantjeksce susvetnaj gistoryi* [History of Belarus in the context of world history]. Minsk, Sovremennaya shkola Publ., 2006. 456 p. (In Belarusian)
10. Golubovich V.I. et al. *Istoriya Belarusi: v kontekste mirovykh tsivilizatsiy* [History of Belarus: in the context of world civilizations]. Eds. Golubovich V.I., Bokhan Iu.M. Minsk, Ekoperspektiva Publ., 2009. 464 p. (In Russian)
11. Treshchenok Ya.I. *Istoriya Belarusi. Ch. 1. Dosovetskiy period* [History of Belarus, part 1, pre-Soviet period]. Mogilev, Mogilevskii gosudarstvennyi universitet, 2003. 175 p. (In Russian)
12. Dzmitrachkow P.F. *Belarus' u skladze Vyalikaga Knyastva Litouskaga (drugaya palova XIII – pershaya palova XVII stst.)* [Belarus as a part of the Grand Duchy of Lithuania (second half of XIII – first half of XVII centuries)]. Magilew, Magileuski dziarzhauny universitet, 2003. 312 p. (In Belarusian)
13. Novik Ya.K., Kachalaw I.L., Novik N.Ya. *Gistoryja Belarusi: ad starazhytnyh chasow pa 2008 g.* [History of Belarus: from ancient times to 2008]. Minsk, Vysheyshaya shkola Publ., 2009. 512 p. (In Belarusian)
14. Elizarov S.A. et al. *Istoriya Belarusi v kontekste evropeyskoy tsivilizatsii* [History of Belarus in the context of European civilization]. Minsk, Vysheyshaya shkola Publ., 2014. 399 p. (In Russian)
15. Elizarov S.A. et al. *Istoriya Belarusi v kontekste evropeyskoy tsivilizatsii* [History of Belarus in the context of European civilization]. Minsk, Vysheyshaya shkola Publ., 2016. 399 p. (In Russian)
16. Brygadzin P.I. *Gistoryja Belarusi w kantjeksce ewrapejskaj civilizacyi* [History of Belarus in the context of European civilization]. Minsk, Belorusskii gosudarstvennyi universitet, 2015. 288 p. (In Belarusian)
17. Chigrinov P.G. *Ocherki istorii Belarusi* [Essays on the history of Belarus]. Minsk, Vysheyshaya shkola Publ., 2004. 463 p. (In Russian)
18. Chigrinov P.G. *Ocherki istorii Belarusi* [Essays on the history of Belarus]. Minsk, Vysheyshaya shkola Publ., 2007. 464 p. (In Russian)
19. Sosna U.A. et al. *Gistoryja Belarusi w kantjeksce ewrapejskaj cyvilizacyi* [History of Belarus in the context of European civilization]. Eds. Lojka L.V. Minsk, RIHS, 2005. 333 p. (In Belarusian)
20. Kren' I.P. et al. *Gistoryja Belarusi: kurs lekcyj. Ch. 1. Sa starazhytnyh chasow da kanca XVIII st.* [History of Belarus: treatise of lectures. Part 1. From ancient times to the end of XVIII century]. Minsk, RIHS BSU, 2000. 656 p. (In Belarusian)
21. Novik E.K., Kachalov I.L., Novik N.E. *Istoriya Belarusi. S drevneishikh vremen do 2013 g:* [History of Belarus. From ancient times to 2013]. Minsk, Vysheishaia shkola Publ., 2013. 558 p. (In Russian).
22. Dmitrachkov P.F. *Istoriya Belarusi. S drevneishikh vremen do kontsa XVIII v.* [History of Belarus. From ancient times to the end of the 18th century]. Mogilew, Mogilevskij gosudarstvennyj universitet, 2015. 354 p. (In Russian)

*Received 8 December 2021*